

Уладзімір Несцяровіч

# Эпоха русалкі

Уладзімір Несцяровіч

# ЭПОХА РУСАЛКІ



Уладзімір Несцяровіч

# ЭПОХА РУСАЛКІ

*Паэтычны зборнік*

Мінск
«Галіяфы»
2016

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Беи)-5
Н56

**Несцяровіч, У. П.**
Н56 Эпоха русалкі : паэтычны зборнік / Уладзімір Несцяровіч ; маст. Стася Сакалоўская. — Мінск : Галіяфы, 2016. — 112 с. : іл.
ISBN 978-985-7140-29-9.

У вершаванай серыі ты міжволі па-свойму пасябруеш з кожным з дванаццаці месяцаў, адчуеш непаўторнае хараство любой пары года або стану надвор'я. Гэтая серыя, як і кожны з прапанаваных аўтарам асобных вершаў, абавязкова не пакіне цябе раўнадушным, бо, чытаючы іх, ты ўласна адчуеш, як напятыя струны тваёй душы загучаць на ўсе лады.

**УДК 821.161.3-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-7140-29-9**
© Несцяровіч У. П., 2016
© Сакалоўская С., ілюстрацыі, 2016
© Афармленне. ПВУП «Галіяфы», 2016

*Пяцісотгоддзю беларускага*
*кнігадрукарства прысвячаецца*

# РОЗДУМ НАД РАЗГОРНУТАЙ КНІГАЙ

Мой шаноўны чытач, ты, як і кожны з тых, хто аднойчы нарадзіўся, перажыў той шчаслівы ўзрост, калі перапоўненая цераз край душа імкнецца за межы ўласнай свядомасці. Падобная думка вынікае ў першую чаргу з умоў твайго жыцця на дадзеным этапе, калі юная, дапытлівая, але зняволеная цеснатой школьнай аўдыторыі няўрымслівая натура спрабуе знайсці той выток, які ў далейшым, набіраючы разбег, абавязкова ператорыцца ў шырокае рэчышча багатай свядомасці, дзе ёй, будзь сказана вуснамі паэта, аўтара кнігі:

...тут усё цікава, нова,
Як той ля берага чарот,
Як і прыроды нашай слова...

Хай сабе паэма «Эпоха русалкі» не з’яўляецца копіяй асобнай старонкі рэальнага жыцця паэта ў яго школьныя гады. Гэта, як ён сам прызнаецца, не проста тое, што аднойчы адбылося ў іх з сябруком-аднакласнікам Петрусём, а тое, што магло б адбыцца з імі ў час уяўнага падарожжа па рацэ Кляве. Гэта разважанне аб паводзінах падлетка ў момант экстрэмальнай сітуацыі.

Будуючы сюжэт паэмы паводле канонаў класічнай літаратуры, якая сфарміравала яго самога як літаратара, паэт невыпадкова знаёміць чытача з вясковым рыбаком, адпетым браканьерам Крумкачом. Той браканьер усплывае потым (у прамым сэнсе) тапельцам, якога юныя вадаплаваецелі апантана выратоўваюць ад смерці.

Нягледзячы на абмежаванасць жанру прыгодніцкай паэмы, якім карыстаецца аўтар пры раскрыцці вобразаў, ён умела паказвае аб'ёмны працэс паступовага сталення юных персанажаў і маральнае ўдасканаленне іх свядомасці. Алесь і Пятрусь, якія ў пачатку твора гатовы наіўна і бесклапотна ганяцца за качанятамі-лапунамі, у далейшым ужо самастойна здольныя прыняць дзёрзкае, смелае рашэнне ў самых безвыходных абставінах, хаця падобнае з імі адбываецца ўпершыню. Алесь, які, спрабуючы захаваць лодку на мяжы бабровай плаціны, сам трапляе ў вір, ледзь не ўтапіўшыся, выпраўляе трагічнае становішча. Толькі гэта ў яго атрымліваецца пакуль безразважна, як бы спантанна, далёка не так, як пазней, калі яны апынуліся пад лодкай, прыціснутыя дрэвам у час навальніцы. Свой экзамен на сталасць яны канчаткова здаюць у выпадку з тапельцам Крумкачом, калі справа датычыць выратавання хаця б зусім выпадковага для іх чалавека.

Змест паэмы — гэта свайго роду глыбокае захапленне веліччу той звышзямной сілы, што фарміруе ў чалавеку сталасць. Аўтар, як бачна, не выдзяляе з агульнага асяроддзя кагосьці мудрага як народжаную асобу вышэйшай касты. Для яго мудрасць — гэта рыса характару, што ў той ці іншай ступені праяўляецца ў асобе чалавека, з гадамі напаўняючы яго душу да так званай мяжы мудрасці:

...Папі вадзіцы, не сумуй,
Тады напэўна мудрым станеш.

Але на думку аўтара, напоўнены карэц — зусім не эліксір жывой вады. У дадзеным выпадку звы-

чайны да незвычайнасці глыток, які Алесь прапануе Петрусю, дае магчымасць не толькі адчуць асалоду паспяховага завяршэння іх доўгага і ў той жа час небяспечнага падарожжа, але таксама атрымаць сваю долю жыццёвай мудрасці, такой неабходнай кожнаму з нас.

Вядома, аўтар не адразу стаў на пазіцыю падобных смелых разважанняў, выкладзеных у паэме. Стварыў Несцяровіча як літаратара той загадкавы свет казак, што паланіў яго з ранняга дзяцінства, калі толькі навучыўся хадзіць і захапляцца тымі малюнкамі, якімі быў напоўнены акаляючы яго свет, народжаны самой прыродай. У далейшым у свядомасці паэта фарміруецца свой светапогляд на навакольныя з'явы жыцця. Вось чаму паэму можна лічыць у пэўнай меры аўтабіяграфічнай.

У паэта ёсць высакародная рыса выхоўваць у свайго чытача дапытлівасць, здольнасць разважаць. А яшчэ, апроч таго, навучаць бачыць у зусім звычайных з'явах, нават калі яны адбываюцца ў дзікай прыродзе, зусім незвычайнае. Думаецца, казка «Падмануты мядзведзь» і ёсць выдатная спроба аўтара паказаць дзецям тое, што непадуладна звычайнаму воку (серыя вершаў «Кожны з дванаццаці»).

*Іван Ярашэвіч,*
*член саюза пісьменнікаў Беларусі*



# ЭПОХА РУСАЛКІ

Прыгодніцкая паэма

## ЭПОХА РУСАЛКІ

Адкуль Клява бярэ пачатак? —
Аднойчы ў бацькі я спытаў,
Калі мы пасвілі з ім статак
Сярод густых мурожных траў.

І адказаў мне мудры тата:
— Аб тым здагадваюцца сны.
Адкуль Клява бярэ пачатак,
Ты сам даведайся, мой сын.

Пасля такой яго інтрыгі
Хадзіў я доўга сам не свой.
Дзянькі плылі, як тыя крыгі
Вясновай бурнаю Клявой.

Прыкметна высахла і пойма,
Травіцай свежай парасла,
А я ранейшы, неспакойны —
Душа кіпела і цвіла.

І вось заканчваўся мой шосты,
Калі аднойчы пад урок
Крануў я сябра свайго локцем:
— Ці чуеш ты мяне, Пятрок?

Я план свой горача выкладваў,
Які бярог часіну ўсю,
Ў парыве страсці неадкладна
Тут на ўроку Петрусю.

Пасля мяне чакала кара,
Яе чыніла красамоўна
Як промень вострая Тамара,
За ўсіх мацнейшая Пятроўна.

Усёй душой за дысцыпліну —
Выкладчык алгебры сухой
Тады сказала мне: не кінеш —
Век працаваць табе з сахой.

Яна мяне, малога блазна,
Вяла ў настаўніцкую здаць,
А там яшчэ крутую лазню
Паабяцала паказаць.

Лягла на стол і дакладная:
То быццам я сарваў урок.
Дык на мяне Тамара злая —
Шаптаўся ж я, а не Пятрок.

Хвядос Міхайлавіч, дырэктар,
Зацята некалькі маўчаў,
А мне, прызнаюся канкрэтна,
Лягчэй-ма, каб жа ён крычаў.

Была і з завучам «размова»,
Як з тымі, што і да яго.
З нямым нявылітым дакорам
У мой бок зірнуў — не больш таго.

Усе прыгнечана маўчалі,
І нават класны кіраўнік,
Як піянер Марозаў Паўлік,
У падлогу позіркам панік.

Нібы не я — малы кірпаты
І неспакойны, як сарока,
А гэта сам ён вінаваты
У зрыве нашага урока.

Тады сказаў: ідзі, дзіцятка.
Я больш нічога не пачуў.
А сам мяне бы родны татка,
К дзвярам пяшчотна падштурхнуў...

Пасля апошняга ўрока
Я закрычаў, нібы вар'ят:
— Мы паплывём, Пятрусь, далёка
Між берагоў, стажкоў і хат!

І нам ужо не да рагатак —
Страляць, палохаць вераб'ёў.
Сярод бабровых ціхіх хатак
Мы неўзабаве паплывём.

Я разумеў: няма рэзону
Дарослых штучкамі злаваць,
Але ў «Палескіх рабінзонаў»
Урок сам вырашыў узяць.

Таму хутчэй, як толькі можна,
Дзяліў сакрэт я з Петрусём:
— За лёс у гэтым падарожжы
Адказнасць самі мы нясём.

Вандроўка наша не для кволых,
Палюе ж хоць твой дзед Піліп?!
Ў яго, ты ведай, ёсць жа порах,
Ды шроту воўчага адсып.

Павер, спатрэбіцца. Дарэчы,
Я прынясу на наш прычал
У рукзаку сваім заплечным
Адмайстраваны самапал.

* * *

Спяшае сонечнае лета
Крывой сцяжынкай да ракі,
Мы ж, апантаныя, з імпэтам
Заняты справай, бы жукі.

А вунь і лодка каля ганка
Чакае моўчкі на двары,
Яе пасля налітай шклянкі
Рыбак нам шчодра падарыў.

Рыбак па прозвішчы Крумкач —
Бабыль вясковы, больш таго,
Даруй, шаноўны мой чытач,
Не паважалі ў нас яго.

Было за што, бо сам Крумкач
На лодцы гэтай браканьерыў,
Тады яе якісь смяльчак
Пашкодзіў трохі грук-сякерай.

Таму рамонту просіць трошкі,
Нібыта нам з Пятром на зло:
У борце не хапала дошкі,
У другім — таксама не было.

Але ж і дно патрэбна ладзіць
Нам заадно, калі ўлічыць,
Што праз яго сабака лазіў
Пад лодку ў спёку адпачыць…

Мы рыхтавалі ўсё з парывам:
Матэрыялы, інструмент,
І калі вам прызнацца шчыра,
То прытаміліся ўшчэнт.

У нас работа так кіпела,
Бы ў тога мудрага Пятра,
Што для Расіі каравелы
Рабіў, лічы, з-пад тапара.

А мы з такім жа вось імпэтам
Рамантавалі свой «баркас»,
То каб не канула ў лету
Задумка наша па той раз.

У дне, бартах рэстаўраваных,
Дарэчы, шчыліны былі,
Мы іх усе пасля старанна
Кудзеляй туга затаўклі.

Затым у лесе пабывалі —
Была ў тым свая патрэба:
Мы там смалы тады надралі
Ў сасны высокай, аж пад неба.

Чакала тонкая работа
Пасля мяне і Петруся,
Касцёр гарэў ля лодкі потым,
Нібыта смажылі гуся.

Ды не гусём тут пахла справа,
Смалілі лодку — аж раўлі,
З-за гэтай нуднае «забавы»
Балюча рукі папяклі.

Бінтоў баяліся, не бралі,
Тады было не да бінтоў,
Каб дома нас не дакаралі
Хоць проста так за будзь здароў.

І тут паймелі мы навуку,
Пра тое лепей не казаць,
Бо тыдні з два насілі рукі
Ў кішэнях, каб не паказаць.

Але ж не скончана работа,
То зразумела і аслу:
Каб на вадзе трымацца потым,
Нам неабходна па вяслу.

Бяда: балючымі рукамі
Не зробіш вёслаў, хоць памры —
Мы нібы ўспёрліся на камень
Ці апынуліся ў муры.

* * *

Сяло сканчае касавіцу,
Яно жыве на поўны голас,
Ужо малацьба, палёў царыца,
На зуб спрабуе буйны колас.

Нядаўна ліпы адцвілі
І пчолы мёду нанасілі, —
Вы нас паклічаце калі,
Ракі нязведаныя мілі?

Ды наша лодка на вадзе,
На ёй плыві ты колькі хочаш
У падарожжа хоць удзень,
А хоць сярод пахмурай ночы.

Яна ўжо вазіла нас,
Мы шчасце мелі ў ёй катацца,
Ніхто, дарэчы, у той час
З нас не асмельваўся смяяцца.

На лодцы зручна на Кляве,
Яна блішчыць ад фарбы яркай,
Караблік наш цяпер жыве
Пад звонкай назваю «Русалка».

У промнях сонечных, ты бач,
Заззяла, быццам бы пад лакам.
Аж вочы вырачыў Крумкач,
Калі яе заўважыў раптам.

— Спытаў бы я на гэты раз,
Чыя ў вас лодка, дзеткі?
Вось на такой і я б якраз
У тонях кідаў свае сеткі.

Пятрусь яму тут нагадаў:
— Мы лодку не ўкралі,
Прабач, ты нам яе аддаў,
Дык мы пафарбавалі.

А ён тады ажно ўспацеў,
Нікольні не здаецца,
Маўляў, спаліць яе хацеў,
Каб хоць адно пагрэцца.

— Ды годзе ўжо ваду муціць,
За борт такі харошы
Вы мне павінны заплаціць
Яшчэ ў дадатак грошы.

Пятрусь тлумачыў, ледзь не плакаў,
І мне было таксама горка,
Ды дзякуй, выручыў сабака,
Які загаўкаў на падворку.

Зароў так моцна ваўкадаў,
Што чутна каля рэчкі,
Нібыта конь яго таптаў,
Ці ўдарылі карцеччу.

Рыбак ураз змяніўся ў твары
(Душы, відаць, выношваў грэх).
Нібыта ўвесь абліты варам,
Ён да двара свайго пабег.

На тым і скончылася ўсё,
Не бачыць і не ведаць,
А мы на той раз з Петрусём
Рашылі не абедаць,

Каб зберагчы каштоўны час.
«У плаванне вам заўтра,
Паўдня ўсяго ў запасе ў вас!» —
Загадвае «Русалка».

Паўдня ўсяго, а колькі спраў
Рашыць нам прадстаяла,
Хто ў нашу шкуру не трапляў,
Той нам паверыць мала.

Пятрусь дык вуды рыхтаваў,
Рваў яблыкі і дулі,
А я вось бульбы накапаў,
Дабраўся да цыбулі.

Усё, што ў градах падрасло,
Прыдатнае для ежы,
У рукзак паходны наш лягло
У стане самым свежым.

Ды асабліва ад таго
Душа так і плясала,
Як да астатняга ўсяго
Далі нам хлеба, сала.

Узялі сякерку, па нажу
(Складанчыкі, вядома),
Плашчы на выпадак дажджу
Для нас знайшліся дома.

Да юшкі, потым, ля кастра,
Прыправы ўзялі трошкі.
— Ну што, Пятрусь, дык нам пара,
Прысядзем на дарожку.

Паходны дзённік адкрываю
Вось тут, на лопасці вясла:
«Мы ў падарожжа адплываем
Сягоння, трэцяга чысла».

Я запісаў і, загарнуўшы,
У рукзак паходны палажыў,
Які затым крутой падушкай
Мне ночкай цёмнаю служыў.

* * *

Нас у паход праводзіць вёска,
Такое, братцы, ў першы раз,
Таму нязвыкла і няпроста
Нам з Петрусём у гэты час.

І вось за тым вясковым плотам,
Які пралёг праз агароды,
Уздоўж ракі, з-за паварота,
Вітае шчыра нас прырода.

Яна — душы спакуснай нота.
Гэй, прыпыніся, часу бег!
Усё гэта ў дзённік ляжа потым,
Як з лодкі ўстанем на начлег.

Над галавамі свеціць сонца,
Гладышкі тут — рукой падаць,
Вада празрыстая: на донцы
Пясчынка кожная відаць.

— Пятрусь, дык колькі ўжо вякоў
(Паварушы мазгамі смела)
Дно паліруецца ракой,
Каб гэтак радасна блішчэла?

— Ты хваткі, брат, цяпер на жарты,
Мастак, відаць, пакпіць з мяне, —
Такі, як там, за школьнай партай.
А я яму: табе ж відней.

Штораз калышучы вяслами,
Мы па вадзе ўжо доўга ходзім,
Не заўважаем нават самі
Гадзін, што бавім на прыродзе.

Раздолле тут лугам, дубровам
Ўздоўж берагоў ракі прыгожай,
Усё ў фарбах каляровых —
Мы адарваць вачэй не можам.

Пятрусь, глядзі, якое шчасце!
Здаецца, качкі ў трыснягу
Ў затоку хочуць пахавацца,
Нібыта ў цёмную смугу.

Ды не, дарослая чыранка
Ўзляцела, упала, нібы камень,
І, прытварыўшыся падранкам,
Давай цялёпкацца прад намі.

Ты бач, ратуючы дзяцей,
Сабою нават ахвяруе,
А тыя — сотню нам чарцей,
Бы дым, як ветрыкам падуе,

Знікаюць ціхенька з вачэй
У прыбярэжных чаратах,
Ім зручна гэтак і лягчэй,
Яшчэ ж не ўмее лётаць птах.

Ну, чым не танец качанятаў
Паўстаў на момант перад намі.
У паляўнічых жа прынята
Іх клікаць проста лапунамі.

Плывём з вялікім захапленнем.
Дык вось жыве дзе наша шчасце,
Душы вялікае збавенне
Ад суму, сораму, напасцяў!

Цікава нам, што ўбачым потым,
Які малюнак будзем мець,
Што там, за новым паваротам,
Зноў пашанцуе нам сустрэць.

Як для мяне, то ўжо залішне,
О, вока беднае маё! —
На палявым пустым узвышшы
Стаіць старое кладаўё.

Аб тым, што могілкаў баюся,
Пятрусь здагадваўся і так,
На гэты ж раз убычыў, мусіць:
Мой твар зрабіўся бы наждак.

— Чаго дрыжаць і твар, і плечы? —
Пачаў ён жартам даставаць. —
Нябожчык будзе нам дарэчы,
Хоць дапаможа веславаць.

— Навошта могілкі, скажы ты? —
Я запытаў у Петруся, —
Расло б у полі лепей жыта,
Ці ніва добрага аўса…

— Няўжо дагэтуль не ўрубіўся?
Падумай сам, здзіўляцца годзе,
На самай справе ты забыўся?
Паўз іх жа мы ў школу ходзім.

— Эге ж, цяпер я не баюся,
Знаёмы мне такі маршрут,
Я лепш устану, пакланюся,
Бо дзед знаходзіцца мой тут.

А вербы ніцма палягаюць,
Хоць ім так блізка да вады,
Нібы дажджу яны чакаюць
Ці мо таму, што тут клады…

Правей ад могільніку поплаў.
Здаецца мне, рукой падаць,
Але яшчэ нам доўга потым
Было ракою веславаць.

Але нарэшце, калі глянуў
З-за берагоў крыху вышэй,
Убачыў раптам Любушаны,
Дык не адняць было вачэй.

Прыгожай нам паўстала вёска.
— Цалуй, Пятрусь, царкоўны крыж,
Бо распазнаць зусім няпроста,
То Любушаны ці Парыж.

Мы вёслы ўгору падымаем,
Бо годзе ім ваду чарпаць,
Ад стомы голасу не маем,
Каб Любушаны прывітаць.

Кідаем позіркі наўкола,
Ты, Божа, нас не асудзі,
А вунь на ўзвышшы наша школа,
Яна вітае нас, глядзі!

«На фланг» узялі — баявыя,
Усе яны ўжо сёмы клас.
Вунь Каця, Толя і Марыя...
Як шмат сяброў сягоння ў нас!

Кранальна тут гучаць фанфары,
Арганізавалі ж цэлы фэст,
І мы былі тады ва ўдары:
У гонар нам падобны жэст.

Пасля ўручылі і пакет нам
(Не скажаш: сёмы — дзетвара)
На ім пазначана: «Сакрэтна!
Распакаваць каля кастра».

Вось развітальныя хвілінкі
(З Пятром нам толькі б не раскіснуць)
У паветры лёгкія хусцінкі,
А хлопцы моцна рукі ціснуць.

Глядзяць у вочы нам адкрыта,
Хоць іх з сабою забяры,
Зайздросцяць, што ні гавары там,
Сягоння трошачкі сябры...

* * *

Не адступаць жа нам ад планаў,
Хоць падарожжа, ды — работа.
Нябачна ўжо і Любушанаў,
Яны — за сёмым паваротам.

З лугоў пацёк вільготны водар,
Паплыў над рэчкай ціхі вечар,
Нас атуліла прахалода.
Пятрусь задумаўся аб нечым.

З якой прычыны не пытаю,
Яго душа на самым дне,
Сам адчуваю, што знікае
Настрой ранейшы і ў мяне.

— Дык што, Пятрусь, на сёння хопіць?
— Але ж, але! Ужо пара нам, —
Прыкметна ўзрадаваўся хлопец.
З ракі павеяла туманам.

— То чысты бераг выбіраем,
Каб зручна нам было прычаліць,
Ды дроў тым часам назбіраем:
Касцёр ніхто нам не распаліць.

Аднак амаль з паўкіламетра
Нам давялося лодку гнаць,
Пакуль знайшлося тое месца,
«Русалку» дзе прышвартаваць.

Далей было ўсё вельмі проста,
Яшчэ б хто болей бедаваў —
Вунь Рабінзон свой дзікі востраў
З нуля гадамі абжываў.

А гэта — кут лясной прыроды,
Святы і чысты божы рай,
Ты толькі вось з такой нагоды
На ўходзе ногі выцірай.

Ды ў рэшце рэшт, калі прызнацца,
Будзь гэта сказана да слова,
Я не дазволіў бы з'яўляцца
Тут грубіяну, брыдкаслову.

Не толькі з бруднымі нагамі —
Недапушчальна, каб хто йшоў
Сюды з душой з пудовы камень,
З цяжкой, запэцканай душой.

Пад неба тут лясныя шаты
Усталі толькі б нас хаваць
Ад тых дажджоў тугіх, упартых,
Што зверху здольны даставаць.

Вось дуб, стагоддзямі апеты,
Равеснік ён сваіх вякоў.
Каму ж яшчэ свае сакрэты
Даверым сёння з сябруком!

— Пятрусь, глядзі ты, гэта ж сімвал
Краіны нашай — Беларусі,
Ідзі сюды, мы дуб абдымем —
З табою побач станаўлюся.

За рукі ўзяўшыся, з упорам
Мы сталі шчыльна пры камлі,
Ды толькі, мусітка, пяцёра
Ў абдымкі ўзяць яго б змаглі.

Нішто сабе, дубок дарослы,
Напэўна, ён адзін такі.
Мы да яго падпёрлі вёслы,
Зложылі побач рукзакі.

З кустоў, з-за дрэваў ваўкавата
Сачыў за намі дзікі змрок.
— Аднак жа ён, нямы, патлаты,
Агню баіцца. Га, Пятрок?

Цябе не хочам мы тут бачыць,
Глядзі, хаця б не апякло,
Ляці туды, дзе совы плачуць,
Хавайся ў цёмнае дупло!

Ён задрыжэў азябла ў лісцях,
Затым асклабіўся ганебна,
Пакурчыў рожы — растварыўся
У вышыні начнога неба.

Як у такіх выпадках кажуць,
Змрок уладарыць да пары.
А мы ўзяліся сала смажыць
У час вечаровы пры кастры.

Ды ледзь вады не абпіліся,
Падмацаваўшыся як след,
Тады заўзята ўзяліся
Мы распакоўваць той пакет.

У ім для нас знайшоўся компас,
Ляжалі грошы і пісьмо.
— Чытайма! — крыкнуў я ўголас, —
Аб чым паведаміць яно?

Пятрусь, хутчэй чытай услых!
Я ж слова кожнае лаўлю:
«Вітаем вас, адважных, смелых,
Вы пакараеце Кляву.

Мы любім вас і паважаем»...
З ліста рабілася вядома,
Што грошы гэтыя сабралі
Нам на зваротны шлях дадому.

«...Умова: з лодкай развітацца,
Як з непатрэбнаю нікому».
Самім параілі дабрацца
Дарожным транспартам дадому.

А лодку потым датараняць
Ужо зусім чужыя людзі,
Маўляў, каб нам праблем убавіць.
Таму і клопату не будзе.

— Дык трэба гэтае пасланне
(Пятрусь пажваў чагосьці ротам)
Цяпер прыняць за прадпісанне
І як загад выконваць потым.

* * *

—Русалку бачыў ты ці не, —
 Пятра спытаў я не адразу.
—Аднойчы бачылася ў сне,
Аднак прыгожая, зараза.

— То раскажы, паслухаць хочу, —
Я бы між іншым папрасіў.
— А мо нявартa супраць ночы?
Каб ты ў сне не галасіў.

— Я не ўражлівы быў змалку.
— Дык слухай, як такі ахвочы,
Не пра каго, а пра русалку, —
Сказаў Пятрусь, зрабіўшы «вочы».

Ну і дзівак! Ды больш таго,
У гэты час, я без падвоху,
У вачах гарачых у яго
Мільгнула цэлая эпоха.

З мяне і гэтага хапіла б,
Але Пятра ўжо не спыніць,
Гародзіць так заўзята, з пылам,
Дык гэта праўда, ці маніць?

Пятрусь як быццам з меншым братам,
Каб адпачыць аднойчы ў смак,
Прыйшоў да рэчкі, зухавата
Між дрэў падвесіў свой гамак.

Навокал стомленая ціша,
П'ючы ваду, сапуць каровы,
Пятрусь гамак усё калыша,
Сам задрамаць ужо гатовы.

Бы ў тумане гамак-качалка,
Яго рука не адчувае,
Ды бачыць — тут з вады русалка
Спакойна, ціха выплывае.

Русалка ў вобразе дзяўчыны,
У яе круты, увесь голы, бюст,
А вось ніжэй, ад палавіны,
У лускавінках рыбін хвост.

Сама ад берага ўжо блізка,
Вачасты твар аж дух займае —
Пятрусь сваю гамак-калыску
Ў адчаі позіркам шукае.

А гэта ўжо не гулі ў цацкі,
Блукае позірк, ды дарма,
У грудзях застыла ўсё мярцвяцкі,
Каб крыкнуць — голасу няма.

— Не бойся, твой гамак на месцы,
Ты бач, які прыгожы брацік,
Ад шчасця бацька засмяецца,
А як узрадуецца маці!..

І паказала Петраку.
Дык ён тут ледзьве не самлеў:
Прад ім ягнятка ў гамаку,
Хоць ты нясі яго ў хлеў.

— Што пазіраеш з недаверам,
Ці, можа, брацiку не рады?
Яго магу зрабіць я зверам,
А калі хочаш, будзе гадам.

Прачнуўся ўвесь абліты потам,
Нібы вадою з чарпака,
І як узрадаваўся потым,
Што знік гамак, а з ім — рака.

...Усход на небе ружавее,
У нас начлег нібыта ўкралі,
Касцёр наш зыркі толькі тлее,
А мы амаль што і не спалі.

Але Пятрусь як дзіцяня,
Наогул хлопец ён забаўны,
Вунь спіць, нібы прадаў каня,
Хоць размаўляў зусім нядаўна.

Я ж палахлівы вось такі,
Нібы начная курапатка,
Улёгся тварам да ракі
Ды варушу плячыма зябка.

Блукае позірк па Кляве,
Хоць сам я гэтага не хочу:
А ці русалка не ўсплыве,
Ці да мяне не зарагоча...

* * *

Зноў па вадзе імкне «Русалка»,
Мы з Петрусём у лодцы самі
Плывем упэўнена і шпарка
На вёслах, як пад парусамі.

Плывем праз тоні і брады
Удалячынь па грэбнях хваляў,
Усё туды, усё туды,
Дзе мы ніколі не бывалі.

Нам тут усё цікава, нова,
Як той ля берага чарот,
Як і прыроды нашай слова,
Як рэчкі новы паварот.

А за наступным паваротам
Узнік бярозавы масток,
За ім жа бераг без чароту,
Пад ім як ёсць жаўцяк-пясок.

Уюцца ў небе стрэлы-птушкі,
Затым хаваюцца ў пясок,
Глядзі, Пятрусь, — берагавушкі,
У норцы кожнай іх гняздо.

Які палёту іх парыў!
Яны нас быццам не баяцца,
Тут так і чуецца: шчасліў...
І вам шчасліва заставацца!

Пабачыць шмат нам давялося
За той няпросты водны шлях —
Малюнкаў сціплых і вясёлых
Ды і такіх, што проста жах.

То бераг дзікі, то ён пляжны
Здзіўляе нас ізноў, ізноў,
Аб гэтым дзённік мой раскажа,
Калі мы вернемся дамоў.

І паляўнічыя на качак
Праходзяць вунь паўз чараты,
Ёсць тут ахвочыя рыбачыць,
А там сплаўляе хтось плыты.

На лузе дружна сена косяць,
Шарэнгай стаўшы, мужыкі,
Для іх пагоды ў Бога просяць,
За рукі ўзяўшыся, жанкі.

Прыкметна сонца села ніжай,
Каб залаціць лясныя далі,
У затоку ціхую заплыўшы,
Свае мы вуды разматалі.

Нарэшце іх пазакідалі.
Не шанцавала на лінёў,
Але мы ўсё-ткі нацягалі
На юшку тлустых акунёў.

Няхай раскажа тоўсты дзённік
Пра тое, як пераначуем,
А мы тым часам свой законны
Ласунак — юшку — прыгатуем.

Не трэба нам каманды, знаем,
З чаго пачаць сваю тут кухню,
Рашылі: дроваў назбіраем,
Хутчэй хай полымя ўзрухне.

Ужо і юшка закіпае,
Усё як бы ідзе па плану,
Але ж істотай адчуваю:
Штось падазрона ціха стала.

Замоўкла птушак шчабятанне,
Прырода быццам бы знямела,
І піць не просіць нават каня,
Паветра густа пацямнела.

У небе бліснула маланка.
У гэты момант я пачуў
(Не дзіўна ж, парыла так зранку),
Загрукатала: г-р-р-р-р, бум, бум-м-м!..

Яшчэ зірнуўшы раз у неба,
Я зразумеў тады Пятра.
Без слоў дамовіліся: трэба
Аднесці юшку ад кастра.

Пачаўшы хуценька ўпраўляцца,
Не асцярожнічалі мы.
Не мелі права памыляцца,
Ды ў спешцы юшку разлілі.

Зірнуўшы ў вогненнае неба,
Пятрусь мяне развесяліў:
— Бог з ім, з кастром, ён нам не трэба,
Яго ўсё роўна б дождж заліў.

Хто б падказаў, куды падзецца
Ад неспакойнай той стыхіі,
Што навальніцаю клянецца
У гэты час праліцца ліўнем.

— Пятрусь, на гэты раз павер мне,
Бяжым, бо там ратунак наш,
Хутчэй, мы лодку паравернем —
Пад ёй хавайся, там заляж!

Вятруга гне над намі шаты,
Як з луба дождж раптоўна ўліў,
Пярун ударыў бы з гарматы,
Яліну тут жа падпаліў.

Бяжым, бяжым, нам елка свеціць,
Паспець бы, ой-ё-ё-ё-ёй!
Вось мы ўжо бачым лодку з Пецем,
У наступны момант мы — пад ёй.

І назіраем, быццам з дзота,
За ўсім, што робіць дзікі змей,
Пад лодкай нам не так маркотна,
Ды і бяспечней, чым раней.

Цяпер не страшнае і неба,
І нават радуюся я:
Укрыцце — лепшага не трэба,
Ідэя ж з лодкаю мая!

А вецер сілы не збаўляе,
Ён гне яліны перад намі.
Такі бяды навырабляе,
Дастане дрэвы з каранямі.

Пачулі мы страшэнны вэрхал:
На нас алешына лягла.
Удар прышоўся ў лодку зверху —
Як толькі вытрымаць магла!

Але ж мы мелі ў гэтым шчасце,
А вось калі б наадварот,
Дык і ў труну навошта класці,
Як немцы кажуць: маін Гот!*

Бы на сапраўднай той вайне
Пагібель наша побач з намі,
Мы тут, пад лодкай — у труне,
Аб тым не скажа нават камень.

* *Божа мой!*

— Чаго, — крычу, — не лямантуеш?
Лічы, ў магіле я і ты!
Няўжо не бачыш і не чуеш?
Павер, што зараз нам кранты.

— Ды чую, чую, не глухі,
Клянуся прозвішчам і імем:
Ты спінай толькі варухні,
І нашу лодку прыпадымем...

Трашчаць з натугі пазванкі,
Мяжа магчымасці, вядома,
А лодка як валун цяжкі,
Ляжыць над намі нерухома.

Мы зноў бы мёртвыя маўчым,
Баляць цягліцы, ныюць косці,
І вельмі цяжка на душы
Ў мяне ад крыўды горкай штосьці...

Звярнуўся я да Петруся:
— Мы апынуліся ў пастцы.
У рай спяшаецца душа,
А цела дзеліцца на часткі.

Спантанных думак цэлы рой,
У галаве гучыць пагроза,
І ад няўцешнасці такой
Ў вачах нагортваюцца слёзы.

Я доўга, доўга моўчкі плачу,
Бо невыказна хочу жыць.
Пятрусь таксама не іначай
У слязах увесь цяпер ляжыць.

А час ад часу не лягчэй.
Мяне нарэшце асяніла:
— Падкоп давай рабіць хутчэй,
Інакш і праўда нам магіла.

З-пад лодкі ход я сам раблю,
На боль у пальцах не зважаю,
Пятрусь адсоўвае зямлю,
Святых і грэшных дакарае.

Працую шпарка я, заўзята,
Як крот, вылазячы з нары.
А грунт цяжкі такі. Пракляты,
Не паддаецца, хоць памры.

Я працаваў, ламаў пазногці,
На пальцах скуру сваю рваў,
Бы прагна грабячы кагосьці,
Але цярпеў жа і трываў.

Ужо і сілы пакідаюць,
І дыхаць цяжка, нібы ў нетрах,
У гэты час удушша давіць,
Ад недахопу тут паветра.

Капаў з надзеяй патаемнай,
Хоць і было зусім няпроста,
Але няўжо ўсё дарэмна:
Натрапіў я на корань тоўсты.

Таму капаць мне давялося
Глыбей яшчэ, пад корань той,
Нарэшце мабыць удалося,
Пралезці можна — Божа мой!

— Пятрусь, хутчэй, — спрабую клікаць,
А той мне ціха: не магу,
Вады хачу... вадзіцы б выпіць...
— Хутчэй-хутчэй, дапамагу.

Хацеў хлапца праціснуць першым,
Каб даць паветра Петраку,
Але яго на гвозд хоць вешай.
— Тады я першы, дай руку!..

Мы побач з лодкай нібы трупы —
Хто ўгору тварам, а хто ніц.
Устае усход на небе скупа,
Ні ліўня ўжо, ні навальніц...

* * *

Пасля рабінавай начы,
Што ўчора трэсла дол і дрэвы,
Мы заклапочана маўчым,
Але жывыя — хто б паверыў!

У шлях рыхтуемся мы дбайна,
Хмяліць душу азона водар,
Якім, наіўных ды адчайных,
Нас частаваў Пярун учора.

Мы зноў у лодачку-гайдалку
Свае ўклалі рукзакі,
Затым прымае нас «Русалка»
На борт над хвалямі ракі.

Бывай, наш слаўны родны бераг,
Цябе запомнім назаўжды,
Не трэба новых нам амерык,
Не трэба іншае вады.

Хаця палову дня праспалі,
Ды аніякае бяды.
Ужо Клявы празрыстай хвалі
Змываюць нашыя сляды…

Здаецца, рыбу ўжо лавілі,
Цяпер так хочацца грыбоў,
Якіх, сказаў бы я, павінна
Шмат нарасці пасля дажджоў.

Вось так аднойчы на світанні
Мы абмяркоўвалі свой план,
Пры тым сур’ёзна вырашалі,
Чым лепш заняцца сёння нам.

Грыбы ў нас! На тым і кропка, —
Рашылі мы на гэты раз,
Тым больш хадзіць жа недалёка,
Бары пры беразе якраз.

Грыбы — вялікае жаданне,
Пульсуе радасць да нябес,
Бы на вялікае спатканне
Мы з Петрусём ідзем у лес.

Пасля паходнай марш-вандроўкі
(Аб тым хоць дзякуй лес маўчыць)
Без папярэдняй трэніроўкі —
Нам давялося адпачыць.

У торбах нашых — ні лісічкі,
Ці я на іх зусім сляпы?
Гудзелі ногі з непрывычкі,
Бы тэлеграфныя слупы.

Ва ўласных думках патануўшы,
З нас кожны стомлена маўчаў.
— Лепш на вадзе там, чым на сушы, —
Пятрусь узрушана пачаў, —

Бо там, у лодцы, на вадзе,
Ніяк не стаптваюцца ногі,
Там гэтак лёгка, як нідзе —
Без стомы нуднай і трывогі.

У час размовы нашай простай
Мы нейкім чынам адпачылі,
Нарэшце ўспомнілі, навошта
Прыйсці сягоння ў лес рашылі.

Але чаму ж няма ў бары
Грыбоў цяперака, у жніўні,
У дні такой грыбной пары,
Пасля густых, вялікіх ліўняў?

— Давайма думаць галавой,
Пятрусь, а мне здаецца,
Належыць нам грыбы з табой
Шукаць у іншых месцах?

— Але ж але, я заяўлю
Аб тым, што й мне карцела,
Дзе сонца лашчыла зямлю,
Грыбніца там паспела.

У мясцінах, дзе расце чабор,
У верасовых месцах.
Выходзім з бору на прастор,
Гайда шукаць узлескі!

Лес прапануе пільным быць,
Уважлівым, як вока,
Каб незнарок не заблудзіць,
Забрыўшы ў гай далёка.

Ды гэта мабыць не пра нас...
Калі ж зірнулі ў неба:
Мы тут нямераны ўжо час,
Спяшаць на базу трэба.

Бяжым праз лес, танцуюць дрэвы,
Навокал шэрая імгла
Нас як і справа, так і злева
Даволі шчыльна апляла.

Усё замгліла, нават неба,
Але ж якія мы разявы!
Цяпер нам компас, компас трэба,
Бо будзе ноч ліхой забавай.

Навошта компас — кожны знае.
Няма з сабой, бо ён у нас
Як рэч нікчэмная якая,
У рукзаку ў гэты час.

Дарэмна нам ужо старацца
У мітусні пустой бясконцай,
Нам ночку ў лесе пратрымацца,
А раніцой наш компас — сонца.

Так цяжка, прыкра на душы,
З сабою хлебца б нам кавалак,
Ды хоць патыліцу чашы,
Мы ў лесе нават без запалак.

Мы спалі, нібы партызаны,
Сярод дубоў, ялін высокіх,
Хто нерухома распластаны,
А хто спалохана, з падскокам…

* * *

Вада і вёслы — вось забава,
Калі ты небу, сонцу свой,
Калі цябе вітае брава
Ракі разгорнуты сувой.

Калі ў характары ты здольны
Бясконца полымем згараць,
Калі ляціш душою вольнай
Рачныя мілі пакараць.

Рачныя мілі — то не вёрсты,
Калі ты ногі б'еш свае.
А тут узмах крылатых вёслаў
Разгон, дынаміку дае.

На вёслах мы ўжо дзень каторы
Працуем весела, старанна,
Ды вось рака свой дзікі нораў
Нам паказала нечакана.

Спакойна, шырака, глыбока,
Адкуль чакаць ліхой бяды?
Але ж наперадзе пратока,
Адтуль нясецца шум вады.

Пятрусь выкідвае свой палец:
Ты глянь туды, мой дарагі,
Бабры плаціну збудавалі,
Ваду пусцілі на лугі.

Падплыўшы ціха, сузіраем
На незвычайнейшы відок:
Як праз плаціну льецца, грае
Тугі, напорысты паток.

І дзіва, што плаціну тую
Звяры ўзвялі на ўзрух ракі,
Сплялі трывалую такую
Бабры, нібыта на вякі.

Сцяна з галін крывых, кашлатых,
Як дот вайсковы паўстае.
Непадалёк відаць іх хатка,
Цікава бачыць нам яе.

Стаіць нібыта на паляне
Сярод кустоў, дзе лысы ўзгорак,
А там далей, на іншым плане,
Вадой залітая прастора.

Не ўявіць нам, не прыдумаць,
Што гэта водныя звяры,
Жывёлы дзікія — не людзі
Тут цэлы комплекс узвялі.

У захапленні разам з гэтым
Мы з Петрусём не заўважаем,
Што наша лодка непрыкметна
Да вадаспада падплывае.

— Пятрусь, хапайся за альху, —
Крычу (хаця б ён мне паверыў),
А я тым часам узмахнуў
Вяслом і ўпёрся ў цвёрды бераг.

Скачу і сам хутчэй туды,
Наперад выкінуў руку,
Але, набраўшы ў рот вады,
Трапляю ў бурную раку.

Ды толькі й там (самому дзіўна)
Усёй душою я кіпеў,
Жаданнем вытрымаць плаціну —
Здаецца, вытрымаў, паспеў.

Тут у змаганні са стыхіяй
Усё, што можна, мы змаглі,
І як тады, няхай ёй ліха,
На гэты раз перамаглі.

* * *

Клява гайдае нас, калыша
Па вольнай гладзі, як раней,
Мы падымаемся ўсё вышай
Да вусця свежага яе.

Далёкі шлях ты запаветны,
Сярод раскінутых лугоў
Бяжыш крывой імклівай сцежкай,
Наш водны шлях, між берагоў.

Ужо і дзень стаў больш кароткім,
І ночка дыхае свяжэй,
Не абяцае сноў салодкіх —
Бліжэй да восені, бліжэй.

Нам прапануе вечар шэры:
Турысты, свой рыхтуй начлег,
Бо непрыкметна ўжо на бераг
Туман кладзецца, нібы снег.

Мы рыхтаваць начлег павінны,
Звычайны ціхі свой бівак,
Уверсе, недзе на ляшчыне,
Вавёрка возіцца, як птах.

Яна нас нават не баіцца,
Сваім хвастом махае туга,
Той смешна сноўгае і б’ецца —
Нібы пастух гуляе пугай.

Ёй, як сабе, ахвотна веру
(Каб з тога месца не сысці):
Арэхаў поўных на вячэру
Няйначай хоча там знайсці.

І я тады не памыліўся:
На галаву мне градам колкім
Настырна, з выклікам паліўся
Паток арэхавых асколкаў.

Але ў адказ мы засвяцілі
Касцёр гарачы, моцны свой
І на вавёрку напусцілі
Ружовых іскраў цэлы рой.

Не пакідаючы злавацца,
Малы задзірлівы звярок
Ў даўгу не хоча заставацца,
Шле з вышыні нам свой папрок.

Але ўжо гэта, мусіць, з лішкам,
Ты бач, нахабніца якая!
З яліны ўжо зрывае шышку
І тут жа ў нас яе кідае.

Нам добра, весела і дзіўна.
Вавёрка, зноў што-небудзь выкінь!
Было так хораша, прыемна,
Што не адны мы ў лесе дзікім.

Так, не адны былі тады,
Мы не адны — на самай справе,
Хоць не чакалася бяды,
Яна з'явілася на яве.

За поўнач, мусітка, было,
Як на рацэ агеньчык бліснуў,
«А можа, у тым баку сяло?» —
Падумаў я і вочы сціснуў.

Расплюшчыў зноў — няма агню,
Няйначай гэта падалося,
Цяпер напэўна я засну
Спакойна сном сваім глыбокім.

Аднак, нібы на тое ліха,
Сон не прыходзіць да мяне,
А на душы зусім не ціха,
Агеньчык з цемры лье і лье.

Вунь ён варушыцца, мільгае,
Згасае быццам ад вятроў,
Ды зноў упарта ўзнікае
Між палахлівых чаратоў.

Я сябрука будзіць спрабую,
Яго варушачы руку,
Той не адразу, але чуе:
— Пятрусь, зірні ты на раку.

Цяпер мы ўжо глядзім абодва
Ў той бок. Агеньчык як бы знік,
І хоць зусім неверагодна,
Пачулі нейкі ціхі ўскрык.

Пятрусь мне ў твар глядзіць трывожна,
І я лаўлю ягоны позірк,
Таксама нейкі насцярожаны:
— То, можа, крык аб дапамозе?

Пятрусь схапіўся за ліхтар,
Гучыць ягоны голас строга
Загадам бегчы на пажар:
— Хутчэй, хутчэй на дапамогу!

Бяжым уночы з ім да рэчкі,
Дзе ні дарогі, ні святла,
Вясло хапаю я ў спешцы,
Бо мне нязручна без вясла.

Бяжым мы з ім — адлегласць з гакам,
І тут ля самае вады
На нас накінуўся сабака,
Жахліва нам было тады!

Я настаўляю самапал,
Фіціль успыхвае імгненна,
Нібы з гарматы грымнуў стрэл.
Упаў сабака здаравенны.

Вунь ён з прабітай галавою,
Сам у агоніі страшэннай,
Увесь, сцякаючы крывёю...
Застыла бурбалкамі пена.

На нас сабака больш не гаўкаў,
Ён у траве ўжо спруцянелы,
Смярдзіць навокал тухлым яйкам.
Да рэчкі мы падходзім смела.

Пятрусь наперадзе і моўчкі
Ліхтар на рэчышча наводзіць,
Перад сабою сярод ночы
Мы бачым сетку ў цёмным бродзе.

— Глядзі, Пятрусь, там чалавек...
Ды як вачам было паверыць?
У сетцы той, не бачыць век,
Ляжаў заблытаны тапелец.

— Пятрусь, дык гэта ж сам Крумкач,
Які, раскідваючы сетку,
У ёй заблытаўся, ты бач? —
Што ні кажы — выпадак рэдкі.

Не панікуючы, без слоў,
Без рухаў лішніх і прымерак,
Пакарыстаўшыся вяслом,
Мы сецъ выцягваем на бераг.

Трывогі цяжкай не ўняць,
Яе не мець бы лепш да веку —
Мы неадкладна ратаваць
З Пятром пачалі чалавека.

Але ж не ўмеем каля рэчкі
Адказнай справаю займацца,
Мы, безгаловыя авечкі,
Паміж сабой давай спрачацца.

— Пятрусь, за ногі ты бяры,
Пакуль хвілінaчка ў запасе,
Бо так вучылі дактары
Калісьці нас на класным часе.

Падымем, выліць каб ваду,
Што ў лёгкіх зараз у тапельца,
Я потым рукі прывяду
У рух. Паслухаем і сэрца.

Яго старанна мы трасём,
То на карысць пайшла «нарада»
Нам тут нарэшце з Петрусём,
Дайшлі мы з ім-такі да ладу.

Тапелец наш не божы дар,
Адчуў я гэта тварам:
Ён прыкра дыхаў мне ў твар
Смярдзючым перагарам.

Пасля блукаў вачмі вакол,
Відаць, шукаў сабаку.
Тады — о жах, які прыкол! —
На нас ён рынуўся ў атаку:

— Вы што ўначы рабілі тут?
Жуллё, бандыты, тарбахваты,
Я на бацькоў падам у суд
Ды ўпяку і вас за краты!

Маць вашу так!
Маць вашу гэтак!
Вы развялі ў рацэ бардак,
Вы панаставілі мне сетак!

Што, нацкаваць на вас Быка?
Прад ім і смелы струсіць,
Ды ўжо ж няма, цецерука,
Дадому ўцёк ён, мусіць.

Але чамусьці сам тады
Ён кінуўся на ўцёкі,
Падумаць толькі, і куды?
Падаўся ў лес высокі.

Знікалі гукі ў кустах —
Сляды ліхой пачвары,
Усхапіўся чуйна сонны птах
І месяц знік за хмарай...

* * *

Бавай жа ты, прывал наш горкі,
Аб тым сава хай не рагоча,
Ён пачынаўся ў нас з вавёркі,
Ды стаў зусім бяссоннай ноччу.

Усё, што здарылася тут,
Схавалі ноч, вады патокі,
Але ж яшчэ ёсць божы суд,
Сам Бог — суддзя яго высокі.

Ледзь толькі раніцу замгліла
Ад белі высыпаных рос,
Мы пакідалі тут магілу:
Даруй ты сёння нам, барбос.

І хоць ужо зусім няважна
Казаць што-небудзь тут цяпер,
Ды бараніў ты безразважна
Гаспадара — як дзікі звер.

Таму і выйшла ўсё спантанна,
Аб тым нам суджана тужыць.
Табе зямля наканавана,
Ды ён затое будзе жыць.

Мы пакідалі свой начлег
Без гаманы, без слоў узнёслых,
І неўзабаве на Кляве
Быў чуцен плёскат нашых вёслаў...

Мінула некалькі начэй
Такіх вось дымных, пад загадку,
Але без слёзаў для вачэй,
Ў душы без горкага ападку.

І я, працуючы вяслом,
Тут для сябе адкрыў між іншым,
Што існуе на свеце зло —
Мне гэта ўжо было залішне.

Мацней за намі пісягі
Па хуткай гладзі пралягаюць,
Цясняцца бліжай трыснягі,
Ад нас прастор сабой хаваюць.

Мы разумелі, што Клява
Пакажа хутка свой выток,
Дык вандравалі не здарма,
У тым і ёсць вялікі толк.

Даўно няма тых вольных плёсаў,
Што сустракалі нас раней,
Куды глядзеліся нябёсы,
Дзе рыба плавае вальней.

Ды што казаць: вунь наша лодка
Трэ ў цеснаце свае барты,
Нібы самотная лябёдка,
Што знікнуць хоча ў чараты.

Мы пачалі вачамі мерыць
Раку і пільна прыглядацца,
Дзе выбраць зручны чысты бераг,
Каб на ваду больш не вяртацца.

А тут і вечар ціхай песняй,
Яму аднолму толькі ведаць,
Дзе дым начлежніцкі павесім,
Дзе раніцою будзем снедаць.

У даўгу дымок не застаецца,
Выводзіць лінію сваю,
Я да кастра прысеў пагрэцца
І пухлы дзённік дастаю:

«Апошняй ночы дым свой ловім,
А заўтра ўжо выходзім пешкі
Ў паход туды, дзе вецер волен,
Вадой заліўшы галавешкі».

Я запісаў радкі такія
І вочы ў роздуме закрыў.
Брады ўсе, віры глухія,
На рэчцы кожненькі разліў —

Усё закруцілася на месцы,
Нібы ва ўскораным кіно.
Чамусь не хочу нават есці,
Хаця не еў ужо даўно...

А вось і ранак з-за ракі
Ўстае, здаецца, у дзесяць сонцаў.
Бярэм з сабою рукзакі
І крочым берагам бясконцым.

Мы недалёка ад сяла,
Як шыльда сведчыць, гэта Клёўка,
Дык вось чаму ты ў нас Клява
З такой прыгожай назвай, звонкай!

Далей мы берагам ідзем,
Пільнуем водную дарогу,
Якая нас усё вядзе
І па якой плылі так доўга.

Яна як дзіва дарагое,
Пятляе крута між алешын,
Паўз хмызнякі, куп'ё тугое,
Душу казыча мне і цешыць.

І мы спакойныя: не зблудзім,
Няхай лясун на нас раве,
Мы хвалявацца больш не будзем,
Бо давяраемся Кляве.

Клява — выдатны праваднік,
Яна надзейная сяброўка,
Пры ёй не трапім у тупік,
Мы з ёю вернемся да Клёўкі.

Шыбуем лесам, хмызнякамі,
Ужо сонца хіліцца на вечар,
Адно жаданне толькі з намі,
Але пакуль хваліцца нечым.

— Клява, Клява, скажы мне прама,
Ты дзе хаваеш свой выток? —
Бы з навальніцы, нечакана
Як стрэліў, выгукнуў Пятрок.

— Ды вунь ён там, глядзі, мудрэц! —
Я паказаў на берасцяны
Старанна зроблены карэц,
А сам ад шчасця нібы п'яны.

Карэц узяў я, нахіліўся,
Вады набраў з крынічкі той,
Адкуль клубок празрысты біўся,
Што ўдалячынь пабег Клявой.

— Пятрусь, ты мне цяпер даруй,
Сваю душу навошта раніш?
Папі вадзіцы, не сумуй,
Тады напэўна мудрым станеш...

## ЗАМЕСТ ЭПІЛОГА

Ужо і восень на двары,
Яна нібыта чарадзейка.
А сёння ў школьнай дзетвары
Ідзе ўрачыстая лінейка.

Раўняцца сказана на флаг.
Зайгралі голасна гарністы,
А потым стала ціха так
І незвычайна ўрачыста.

Застыў іх строй, як перад бітвай,
І як заўжды, на гэты раз,
Даўно завучанай малітвай
Гучыць тут школьнікам наказ.

На курс вучобы йдзе наводка,
Але ж звярніце вы ўвагу:
Пры гэтым бачная і лодка
На іншым плане крыху з фланга.

Якая лодка — не сакрэт,
Лічы, з легенды тая «брычка»,
Яе трымае пастамент,
На ім красуецца таблічка:

«Алесь, Пятрусь на гэтай лодцы
Кляву хадзілі пакараць.
Хвала адважным, смелым хлопцам!»
Ім пажадана: «Так трымаць!»

А дзённік той, сказаць да слова,
Як гэта сёння ні забаўна,
На класны час не выпадкова
Запланаваў пасля настаўнік.



# ПАДМАНУТЫ МЯДЗВЕДЗЬ

Вершаваная казка

*Брату Анатолію*
*прысвячаю*

## ПАДМАНУТЫ МЯДЗВЕДЗЬ

Быў сакавік. Мядзведзь у бярлозе
Паварушыў вушамі ў сне:
— Здаецца, не. Не адмарозіў —
І ўсміхнуўся ён вясне.

Цяжкім было вясны чаканне,
Таму, адкрыўшы толькі вока,
Адчуў найпершае жаданне
Папіць бярозавага соку.

Ды ў берлагу глухім і цесным
Ён сіл сваіх патраціў шмат,
Таму не здолеў сам у лесе
Сваю бярозу адшукаць.

Дык хто паможа бедалагу
І хто яго бяду пачуе,
Налье хоць колечкі ў біклагу,
Мядзведзя сокам пачастуе?

«То, можа, воўк нарэшце б змог
Мне аказаць такую ласку,
Яму ж я двойчы дапамог
Пазбыцца злой сталёвай пасткі», —

Падумаў так стары мядзведзь
І ўраз яму пахарашэла,
Лягчэй зрабілася хварэць,
Калі ўбачыў тога звера.

— Кузьма, ваўчочак дарагі,
Прашу, прыслухайся да слова,
Табе ж знаёмыя шляхі
Ў гай бярозавы вясновы.

Прасіў бы я, каб ты туды
Схадзіў з маёй біклагай,
І мы з табой замест вады
Прагналі б сокам смагу.

— Э не, ты чуеш? У бары
Сабакі гаўкаюць заўзята,
Усе хаваюцца звяры,
Аблава ж воўчая пачата.

Табе аддаў я часу многа.
Не пазірай з дакорам хмура,
Лепш абысці тваю бярлогу,
Чым мець прастрэленую шкуру…

Ваўчыдла ў пушчу заспяшаўся,
Яму і сораму няма,
А ў бярлозе ўсталяваўся
Зноў шэры сум, як цішыня.

Прыгожы звер ляснога краю
Шыбуе сцішана, як цень,
Мядзведзь ажыў, ён зноў гукае:
— Чакай, лісічка, добры дзень!

Мяне паслухайся, кума,
Хачу бярозавага соку,
Але ў самога сіл няма
Цягацца ў лес глухі далёка.

— Даруй, Патапавіч, спяшаю
Ў нару сваю да лісянят,
Інакш табе дапамагла б я,
Ты ж мне радней, чым родны брат.

Ліса пабегла пад пагост,
Дзе курганы, дзе нетры-норы,
І толькі бліснуў рыжы хвост —
Навошта ёй чужое гора...

Мядзведзь услед ёй пазірае,
Не адарве сваіх вачэй,
Ад смагі ледзь не памірае,
Бо з цягам часу не лягчэй.

Але ж надзея не кідае.
Ён ловіць зноў чыесьці крокі:
Паблізу заяц шкандыбае.
Чуваць навокал яго скокі...

— Адну хвілiначку, касы, —
Паклікаў голасам трывогі, —
Біклагу соку прынясі,
Бо паміраю ад знямогі.

А той (згубіць яму штаны):
— Ды не, спяшаюся дахаты,
Ты што, Патапавіч, дурны?
У мяне адны там зайчаняты.

Яны ж яшчэ зусім малыя,
Ўсяго чакай ад той шпаны.
Бяды б якой не нарабілі,
Калі знаходзяцца адны.

Малых пакінуць не магу
Надоўга ў хаце без нагляду,
Дык як табе дапамагу,
Хоць памагчы заўсёды рады.

Сваёй не вытрымаў маны,
Пабег, уносячы няўмольна,
Ён тыя белыя штаны,
Што ўсю зіму насіў прыкольна.

І зразумеў тады мядзведзь:
Ніякі звер не дапаможа,
Калі ты сам не будзеш мець
Хоць крыху сіл, каб іх памножыць.

Пераадольваючы боль,
Нарэшце ўстаў, аж захістаўся,
Ён быў нібыта сам не свой,
Але ж усё-такі падняўся.

«Не хочу мяса нават мець,
Не трэба хлеба мне, кампоту», —
Казаў тады сабе мядзведзь,
Перамагаючы сумёты.

З вядром пустым бабыль бязродны
У самай жаласлівай позе
Валюхаў, нібы той калоднік,
Сваю шукаючы бярозу.

Ён касалапа ў снезе чухаў,
Заняты клопатам сваім,
А той, касы і даўгавухі,
Смяяўся ціхенька над ім.

Стракаты дзяцел да бярозы
Зляцеў аднекуль у той час,
Калі з вачмі сваімі ў слёзах
Мядзведзь з'явіўся тут якраз.

— Павер ты мне, дабрэйшы звер,
Не застанешся ў даўгу,
Калі, Патапавіч, цяпер
Табе ў бядзе дапамагу.

Стракаты з дзюбаю-стамескай
За працу стаў сваю заўзята,
Пасля ўнізе пад тым месцам
Вядро паставіў звер касматы.

І неўзабаве цуд адбыўся:
У сакавіцкі ясны дзень
З бярозы кручанай паліўся
Празрыстых кропелек струмень…

У тую ноч мядзведзю сніцца
Салодкі сон (у поўным сэнсе).
Магло падобнае адбыцца
Аднойчы толькі ў родным лесе:

Пераадолеўшы сумёты,
Сышоў Патапавіч з гары
Забраць вядро са свежым сокам,
Бо смага душыць, хоць памры.

Ідзе сваім знаёмым ходам,
Здалёк blішчаць ад шчасця вочы:
Вядро напоўненае мёдам —
Бяры ды пі хоць колькі хочаш.

Туды спяшаецца хутчэй.
Ён п’е той мёд так прагна, доўга,
Але нікольki не лягчэй
Мядзведзю ад пітва такога.

Прачнуўся — суха, горка ў роце,
І на душы вось так якраз.
Пайшоў яшчэ раз праз сумёты —
Ужо на яве ў гэты раз.

«Бяроза, мусітка, не тая
Ці не на той гары стаю?» —
Мядзведзь сябе штораз пытае,
Усё шукаючы сваю.

Ён адыходзіў, зноў вяртаўся,
Вакол разгублена глядзеў,
Па дрэвах арыентаваўся,
Ды не было вядра нідзе.

Яно магчыма так, але
Бяроза ўсё-ткі тая,
Відаць і дзірка на ствале,
Бярозавік сцякае.

Вядра няма, кудысьці знікла,
Няйнакш, скацілася ў яр.
І на душы агідна, прыкра,
Сумуе лесу ўладар.

У бядзе сляза — не лепшы сродак.
Рашыў: абыдзецца без слёз,
Каб пра сваё забыцца гора,
Вядро другое ён прынёс.

Але і тое знікла потым,
Куды, — таксама невядома.
Мядзведзь у роспачы, ды толькі
Схадзіў яшчэ разок дадому.

Дык зразумеў: пусты занятак,
Вядра ў запасе больш няма.
Рашыў тайком наведаць хаты
Звяроў лясных. І нездарма.

Калі ж і зайца ён падслухаў,
Нарэшце злодзея пазнаў.
У гамаку сам Даўгавухі
Так хвацка песню распяваў:

— Мне добра жывецца-а
У лесе ля хаты
Цяпер, па вясне-е-е!

Мядзведзь касалапы
Стары і касматы
Частуе мяне-е-е

Бярозавым сокам,
Бяро-о-озавым со-о-о-кам…

Напеў гучыць пад балалайку
З наспех прыдуманага складу.
Вакол яго малыя зайкі
Тут скокі ладзяць да ўпаду.



# КОЖНЫ З ДВАНАЦЦАЦІ

Цыкл вершаў

# КОЖНЫ З ДВАНАЦЦАЦІ

## СТУДЗЕНЬ

Што за месяц сцюдзёны
Новы год распачаў?
У паветры прыкольна
І нязвыкла вачам.

Не інакш гэта студзень
Нам навязвае зімку,
Яго ведаюць людзі
Па суровых абдымках.

Студзень нам сваю волю
Дэманструе спаўна,
Вунь зіма ў наваколлі
Гаспадарыць адна.

Студзень — месяц суровы,
Ён такі, як і быў,
Ён заўсёды гатовы
Выдаць мінус любы.

У мароз ды ў вецер
Можа ўсё ў нас адбыцца,
Хто на дызелі едзе —
Дызель можа спыніцца.

Размарозіць сістэму
Ацяпляльную ўшчэнт,
І шукай ёй замену
У камгасе, кліент.

Студзень — месяц пажараў
З перагрэву пячэй.
Для кватэры вяшчальнік
Набывайце хутчэй.

Студзень студзіць, злуецца
Ды сняжынкі зіхцяць.
І таму так на сэрцы —
Нібы двойчы ў пяць.

Ён баіцца вясёлых,
Хто сабой гаспадарыць,
Тых, хто бегае ў школу
З звонкім смехам на твары.

## ЛЮТЫ

Гайсае шэрая завея
Ў палях пакінутых, пустых,
Галосіць так, што сэрца млее
Ў час няветлівы такі.

Каторы дзень працуе шчыра,
Не менш шчыруе па начах,
Мяце, кідае ў вочы жвірам,
Што ў неба глянуць проста жах.

Вось тут, на самым відавоку,
Курган стагоддзямі драмаў,
Існуючы аб’ектам зроку.
Ды быццам хтось яго ўкраў.

Схавала глыбака пад снегам
Яго — узгорачка няма,
Над ім спынілася з разбегу,
Ажно заплакала сама.

Калі ж ад слёз прасохлі вочы,
Азарт гарэзіць не астыў,
Сама заразліва рагоча
І замятае хмызнякі.

Незразумелыя руіны
На месцы, дзе яны раслі,
Няма дарожных каляінаў,
Куды ні глянь, адзін цалік.

Раве завея, не змаўкае,
На зайздрасць злоснаму быку,
Яна ўжо новых спраў шукае
Ў снягах на лузе паўз раку.

Там, дзе нядаўна быў спакой,
Усім на дзіва і на жах
Лятае крута над ракой,
Лютуе моцна ў берагах.

Вось так ажно з самога ранку,
Папрацаваўшы тут нямала,
Лясную рэчку Грымічанку
Пад снегам глыбака схавала.

Але забылася, відаць,
Аб тым, што з рэчышчам зрабіла,
Яго цяпер ізноў шукаць
Узялася горача, імкліва.

Галосіць роспачна, гукае,
Чагосьці хоча дамагчыся,
Настырна рэчышча шукае,
Аж млее, марна злуючыся...

Калі ж нарэшце завіруха
Нагаласілася ў палях,
Навокал стала пуста, глуха,
У небе выспеў млечны шлях.

А раніцой ледзь толькі золак,
Ад крайніх хат, што ў вёсцы бліжняй,
Пазначыць зноў сваю дарогу
З'явіўся ў полі шпаркі лыжнік.

## САКАВІК

Ён у людзей жаданы самы,
Калі ўсё самім сабой
Пасля зімовай соннай ямы
Ў жыццё імкнецца, нібы ў бой.

З начы мароз бамжуе хватка,
З-пад шапкі вуха дастае,
А ўдзень — пяшчотнае дзіцятка —
Над намі сонейка ўстае.

У лесе снег ляжыць як мёртвы,
Ператварыўшыся ў жарству,
А ён, хоць трэці, не чацвёрты,
Вітае нашую вясну.

З начы шарпак трывалы носіць
Любога з нас, не трэба лыжаў,
А ўдзень пры сонцы ўжо чагосьці
Цяжкімі робяцца нам лыжы.

Да дна правальваюцца ногі
Ў той набрынялы важкі снег,
Тваіх сем крокаў да знямогі,
Мой спадарожны чалавек.

Мядзведзь, сплючы ў сваёй бярлозе,
Паварушыў душою ў сне,
І сонны свой, зацёрты позірк
Паслаў з надзеяю вясне.

Парою доўгаю ў зіму
Рашаць здакучыла судоку,
І захацелася яму
Папіць бярозавага соку.

## КРАСАВІК

Нарэшце сонны снег кранууся
Ў яры сівыя да лагчынаў,
Жаўрук у небе адгукнууся,
Там плыў худы гусіны вырай.

Вясна нясе яго жаданне
На хвалях бурнае ракі,
Пад свежы свіст шпакоў уранні,
Пад звон жыцця ў красавік.

Для нас нарэшце ён узнік,
І час душою адагрэцца,
Разліў Клявы нібы Палік,
Дзівіся ты, як хваля б’ецца.

Крычаць у небе журавы
Сабе і нам усім на радасць:
Наш ключ жывы, жывы, жывы…
Няма калі ў роспач падаць.

І надуваюцца пупышкі
На дрэве кожненькім да звону,
Ужо рыбак свае мармышкі
Адклаў да новага сезону.

У красавік — жаданы час,
Калі спявае птушкай неба,
Прыемна ўжо ў каторы раз
Сябе адчуць вось так, як трэба.

## МАЙ

Ці ж гэта май без салаўя,
Без кветак бэзу ля акна,
Калі ўся душа твая
Бурліць і пеніцца да дна.

Ці ж гэта май без песень звонкіх
Пад тугаструнную гітару,
Што ўсёй працяглаю зімою
Была ў душы тваёю марай.

Твой май у небе над лугамі —
Які размах высокіх мар!
Ты сам ляціш нібы з крыламі,
Бо ты жыцця свайго пясняр.

Твой май — калі ты ўладарыш
Сваімі думкамі бясконца,
Калі ўсмешкаю на твары
Здзіўляеш ранкам нават сонца.

Калі ўзрываешся душою,
Нібы вясновы першы гром,
Калі душа твая без стомы
Імкне да неба напралом.

Твой май тады цябе натоліць
Сваёй жывіцельнай вадой,
Калі ты вучышся ў школе
І марыш свет здзівіць сабой.

## ЧЭРВЕНЬ

Ён шчыры сябар твой, адкрыты,
Пачатак лета, чэрвень вольны,
Бадзёрай свежасцю абмыты,
Сабой цябе пацешыць здольны.

Дзянькамі спраў вясёлых, зычных
У час канікулаў крутых
Ты па жыцці без рухаў лішніх
Нібы на крылах паляціш.

Ён завязе ў цырк сталічны,
У гай заманіць салаўём,
Дзе слаўны птах у песні зычнай
Цябе ўсхваліць на жыццё.

У час канікулаў жаданых
Не трэба казачнага раю.
Ты — неспакойны і цікаўны,
Як многа спраў цябе чакае!

У паход з табою чэрвень пойдзе,
Там іншы свет, там ёсць прыгоды,
Давай даверымся прыродзе —
Які то чэрвень без пахода!

## ЛІПЕНЬ

У зеніце сонечнае лета,
Маладзее роднае сяло,
І жыццём, і працаю сагрэтае.
Птушаняты ўсталі на крыло.

Нездарма нібы для нараджэння
Выбіраем гэтую пару.
Любім мы дзівосныя здарэнні,
Летні дождж, світальную зару.

А дзянькі жаданыя стаяць,
Усе яны адмераныя сонцам,
У лугах чакае сенажаць,
Як жыцця адвечная бясконцасць.

Неўзабаве збожжавая ніва
Шчодра свой адважыць ураджай.
Дык жыві багата і шчаслівa,
Наш цудоўны беларускі край.

## ЖНІВЕНЬ

Я жніўня слухаю хадзьбу
І рух стваральных спраў ягоных,
У палях ліхую малацьбу,
Яе гарачы зыркі подых.

З аблокаў рухам, з шумам рэк —
Вось так прыдумана адвеку —
Усё, стварыў што чалавек,
І прыналежыць чалавеку.

Я чую жніўня гучны дух,
Яго бадзёрыя акорды
І непаўторны той узрух
Даспелай, велічнай прыроды.

Калі ты моцны, варты двух,
Ужо цябе не кіне жнівень —
У ёмкі сноп, як у ланцуг,
Усё знітуе ён рупліва.

## ВЕРАСЕНЬ

Я, збіраючы грыбы,
Вандраваў па лесе,
Заўважаючы тады
Павуцінне ў верасе.

У маладой жывой расе
Выкупаны верас,
І яны ва ўсёй красе —
Тыя кросны верасня.

Зіхаткія ў промнях сонца.
Датыкнуўся я да іх,
Толькі гэтыя красёнцы
Ўжо не тыя з рук маіх.

Прыгажосць уся ўпала
Долу хуценька з расой,
І шкадую я нямала
За бяздумны ўчынак свой.

Цішыня вакол у доле
Паміж дрэў глухіх ляжыць,
Бы нікому і ніколі
Не хацелася б тут жыць.

У такім цудоўным царстве
Сумна штось было тады,
Дзе ўзяць таго лякарства,
Дзе знайсці жывой вады,

Каб звярком мяне зрабіла
Ці то птушкаю лясной,
Мне было б заўсёды міла
На сасне ці пад сасной.

Грыб падняў, перавярнуў,
З дапамогаю нажа
Я з яго тады згарнуў
Бесклапотнага смаўжа.

Хоць якая, ды істота
Ўрэшце трапілася мне
Ў ціхім лесе вераснёўскім
Аж на самым яго дне.

Запытацца быў гатовы:
Дзе насельнікам мяжа?
Ды прыйшоў я да высновы:
Лес мой толькі для смаўжа.

Света, Косця, Макс, Марыя —
Мае юныя сябры,
Адкажыце, дарагія,
Хто жыве яшчэ ў бары?

## КАСТРЫЧНІК

Кастрычнік бабінага лета
(Як шкада: ні ўбачыць, ні дагнаць)
Пад гару імчыць яго карэта,
А куды? — даведацца б, дазнаць.

Шпарка мчыцца, хоць і без матора —
Так ляціць, напэўна, толькі вецер.
І кастрычнік да мяне ўчора
Завітаў раненька, на дасвецці.

Запытаў мяне ён прынцыпова:
Як зіму ты будзеш зімаваці?
А ці ёсць распал, таксама дровы
Для жыцця ў тваёй сялянскай хаце?

У хляўчук наведаўся кастрычнік,
Дзе спакойна рохкаў парсючок.
— Мне цікава, — запытаўся зычна, —
Да зімы ты маеш кумпячок?

А цяпер паказвай: для кароўкі
На зіму кармы ты маеш, брат?
Калі не — рагулю на вяроўку
Ды вядзі на мясакамбінат.

Зазірнуў кастрычнік у кладоўку:
— Дзе мука ў скрыні для бліноў?
Потым вочы на маю ватоўку
Ён падняў, пытаецца ізноў.

Паказаў яму тады валёнкі,
Кажушкі і нават рукавіцы —
Для сябе, для дзетачак, для жонкі —
Усё яго цікавіць да драбніцаў.

Заірдзеў кастрычнік на рабіне,
Гронкамі чырвонымі павіснуў:
— Бачу я: зімою не загінеш, —
І кастрычнік мне руку паціснуў.

## ЛІСТАПАД

Залатая мяцеліца сыпле
На дол, на ваду і дах,
Ціхія, звонкія, ліпкія
Крылы твае, лістапад.

Дрэвы абтрос, ды зноў жа
Шэпчаш на самым дне,
Няўжо-такі сёння зможаш
Забраць у палон мяне?

Гулка і хораша ўранні,
Лес такі пышны, як сад.
Выйшаў сюды на спатканне
Сёння з табой, лістапад.

Дзіўна глядзець мне пад ногі:
Коўдра барвовая тут,
Я не пільную дарогі,
Выбраў адвольны маршрут.

Звонкі навокал малюнак
У зоне крутых забаў,
Мне б тут знайсці паратунак
Ад невылечных спраў.

Ветлівы мой лістападзе,
Сябар маіх гадоў,
Я ў цябе на нарадзе
Сёння сябе знайшоў.

## СНЕЖАНЬ

Дачакаліся вось мы
Радасці вялікай,
Нашай велічнай зімы —
Снежнай і нязвыклай.

Не пазнаць двара свайго,
Незнаёмы ганак,
На якім цяпер стаю,
Сустракаю ранак.

Бель вакол бязмежная,
Адбірае вочы,
Не іначай гэта снежань
Завітаў у госці.

Ён жа першынец зімы,
Што сягоння рана
На завулку і двары
Легла нечакана.

Бель вакол і цішыня
Рэжуць слых і вочы,
Мяне снежань да паўдня
Адпускаць не хоча.

Тонуць куры на двары
Ў снезе пульхным, рыхлым,
Ім тут, што ні гавары,
Дзіўна і нязвыкла.

Ці з мяне рагочуць куры,
А ці, можа, не з мяне?
Выйшаў я зіму з натуры
Маляваць на палатне.

Усё навокал як міраж:
Белы снег, аблокі,
А на фоне іх пейзаж —
Рыскамі, намёкам.

* * *

Я малюю зіму ў наваколлі
І дзяцей тых, што валяць гурмой
З недалёкай вясковае школы
У сняжкі пагуляць між сабой.



# ГОЛАС ПАЭТЫЧНАЙ ДУШЫ

Вершы

## ОДА ХЛЕБУ

Выходзілі школьнікі ўранні
Туды, дзе гамонка жніва,
Дзе песню спяваюць камбайны
Пра хлеб, што ўсяму галава.

Ад сонца, ад чыстага неба,
Ад свежых бадзёрых вятроў
Водар вялікага хлеба,
Як светлая радасць, сышоў.

За буйны той збожжавы колас,
Наліты чароўным святлом,
Камбайны ў поўны свой голас
У поле ішлі напралом.

Зашкальвае градус за трыццаць,
За бортам яшчэ гарачэй,
Халоднай вадзіцай абмыцца б,
Было б хоць на трошкі лягчэй.

Балюча так, горача твару,
Лютуе спякота, як звер,
У момант, нібы на пажары,
Ад поту макрэе каўнер.

Свядомасць камбайнера маніць.
У скроні пульс горача б'е,
І колас, нібыта ў тумане,
Ізноў у вачах паўстае.

А смог, быццам горшае з ліхаў,
Ізноў прад вачмі паўстае,
Душу ў камбайнера ціха
Да самага дна дастае.

Гарачым паветрам абдаўшы,
Злуецца, выкідвае здзек:
Хлусіш, ты ўтрамацца не зможаш,
Упарты зямны чалавек!

Камбайнеры ў нас не з замежжа,
Такімі і моцны раён,
Трымаюцца ўсе незалежна,
Не возьмеш ты іх у палон!

Яны свой характар пакажуць —
Хоць цяжка і млосна, але
Ідуць грамадой экіпажы
За хлеб, што ў нас на стале.

## ШКОЛЬНІКАМ

Сёння ў вас, рабяты,
Дзень такі багаты,
Хараша наўкола,
Вас вітае школа.

Школа — ваша хата,
Тут ёсць вам і тата —
Інтарэс няўмольны
Да навукі школьнай.

Ёсць у вас і мама —
Школьная праграма.
Хутка час імчыцца,
Толькі і вучыцца.

## РАЗВІТАННЕ З ЛЕТАМ

Адходзіш ты за небакрай,
Бо на двары ўжо верасень,
Бывай жа, лецейка, бывай,
Ды прыйдзе час — ты вернешся.

Цябе з сабою ластаўкі
Паклічуць на зары,
З табою сёння ў час такі
І мы — твае сябры.

Нам сумна будзе трошкі,
У школу ідучы,
Прысядзем на дарожку
З табою, памаўчым.

Але ж мы рады сёння,
У школу ідучы,
З табой для развітання
Усмешку зберагчы.

Адходзіш ты за небакрай,
Бо на двары ўжо верасень,
Бывай жа, лецейка, бывай,
Табе мы верым: вернешся.

## НА НОВЫ ГОД

Дзед Мароз у поўнай гаме —
Франт, вачэй не адарваць,
Новы год ён разам з намі
Будзе хутка святкаваць.

Век не ведаючы стомы,
Ходзіць ён пад Новы год.
У кватэры, у кожным доме
Сустракай яго, народ.

З палымяным жартам, смехам,
Ў кажуху такім, як ёсць,
З торбай, поўненькай даверху
Ён у нас жаданы госць.

Навагодніх падарункаў
Будзе ўсім — табе і мне,
Дзед гасцінны на ласункі,
Ён нікога не міне.

Густ любога задаволіць,
Шчодра дорачы пакет,
Для сябе ў ім кожны знойдзе
Таямнічы свой сусвет.

Ды не толькі падарункі
Любім мы на Новы год,
Не адны яго ласункі
Пад вясёлы карагод.

Пажаданняў шчырых слова
На душу — святы бальзам,
Бо яно абавязкова
Ў жыцці патрэбна нам.

## КОЦІКІ

Распусціліся раніцай коцікі
Ля ракі на купчастай вярбе,
А твае элегантныя боцікі
Аддаляюць няўмольна цябе.

І паходка твая вяснакрылая
Ўміг пачуцці душы закране.
Азірніся, прашу цябе, мілая,
Пашкадуй небараку мяне.

Коцік ззяе напорыстай сілаю,
Пачынаючы песню вясны,
Азірніся ў мой бок, хуткакрылая,
Забяры мае мары і сны.

...Распускаліся пышныя коцікі,
Усміхаліся сціпла вясне,
Дык чаму твае шпаркія боцікі
Не паверылі ўсё-такі мне?

## НАШ СЦЯГ

Сцяг беларускі горды, крылаты —
Сімвал багатай душы беларуса,
Горды, як птушка, што кружыць над хатай,
Сімвал рэспублікі нашай.

Сцяг беларускі, створаны намі,
З колераў трох ён прыкметны здалёку:
Белае поле, строгі арнамент —
Сэрца хвалюе глыбока.

Колер чырвоны, што ў кветках святочных —
Промня гарачага шлях,
Кроў беларусаў — сялян і рабочых,
Што пралілася ў баях.

Колер зялёны на сцягу лунае
Велічна ў гордай красе —
Колер лугоў беларускага краю
Сцяг наш крылаты нясе.

Яркая чырвань і свежая зелень —
У школьніка гальштук такі.
Сцяг наш вялікасны, мы табе верым,
Ты нас абняў на вякі.

## НЕБА

Плыве над намі сінява
Ажно кружыцца галава,
Заўсёды шмат у ёй спакою,
Там свеціць сонца залатое.

Ёсць там начныя таямніцы,
Як месяц выкаціцца ніцма,
Пад небам хмары як палотны,
Там журавель — адзін маркотны.

Мяне дражнілі з неба гусі,
Ляцеўшы зноў над Белай Руссю.
У небе думкам спрыт і воля —
Маім. Не прыкмячаў чужых ніколі.

Бывала я, не меўшы сіл,
Да неба рукі ўзнасіў...
У небе нашы ястрабкі
Нямецкіх месераў таўклі.

Таму яго мы бачым розным —
Пахмурым дужа, нават грозным.
Я ў неба дождыка прасіў —
У ім жа дна няма зусім.

Там усявышняга ўладанні
З часоў сусвету самых ранніх.
У небе шмат і хараства:
Палітра фарбаў мастака.

Каб мне не мецъ такой прычыны,
Глядзеў бы доўга ў неба шчыра:
Звышгукавы зямны гарэза,
Навошта неба перарэзаў?!

## АБЯЦАННЕ

У спадзяванні я ляжу ў бальніцы
Шмат аўторкаў, пятніц і нядзель,
Ужо не снег, а грому бліскавіцы
Ў акне зіхцяць каторы дзень.

Без мяне зімой блішчэлі лункі,
І не я тады хадзіў на лёд,
Там цяпер шукае паратунку
Веснавы змарнелы крыгаход.

Не мяне вітаюць з неба гусі,
Без мяне бярозавік цячэ
І клякоча заліхвацка бусел,
І глушэц цярэбіцца яшчэ.

Я ўстану з ложка раным рана,
Абяцаю (гэта ж не канец),
Бо вясной ад шлюбнай песні п'яны
Старажытны птах лясны глушэц.

Абяцаю вам сягоння, гусі,
Што спіхну з сябе халодны лёд,
Я ўстану з ложка, я вярнуся
Ўлавіць імклівы ваш палёт.

І табе, знаёмы гучны клёкат
Нашай птушкі, слаўнага бусла,
Што да нас у апусцелы покут
Зноў прынесла бурная вясна.

Я вярнуся, шчыра абяцаю,
Каб на ліха ўсім сваім напасцям
Узляцець над нашым ціхім краем,
Лебядзінай песняю ўпасці.

## КОРАТКА ПРА СЯБЕ

Аўтар кнігі нарадзіўся ў 1949 годзе на Бярэзіншчыне. Журналіст паводле адукацыі. Член Беларускага саюза журналістаў, саюза пісьменнікаў Беларусі. Доўгі час працаваў у мясцовай прэсе, адначасова займаўся літаратурай. На яго рахунку паэтычны зборнік «Сто дарог», аповесці «Непрыручанае рэха», «Круты ўзлёт», разлічаныя на чытача школьнага ўзросту.

# ЗМЕСТ

Роздум над разгорнутай кнігай .................... 7

Эпоха русалкі ............................................ 13

Падмануты мядзведзь ................................. 67

Кожны з дванаццаці .................................... 79

Голас паэтычнай душы
Ода хлебу ............................................... 97
Школьнікам ............................................ 99
Развітанне з летам ................................. 100
На Новы год .......................................... 101
Коцікі .................................................... 103
Наш сцяг ............................................... 104
Неба ....................................................... 105
Абяцанне ............................................... 107

Коратка пра сябе ....................................... 109

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Несцяровіч** Уладзімір Паўлавіч

**ЭПОХА РУСАЛКІ**

*Паэтычны зборнік*

Адказны за выпуск *Зміцер Вішнёў*
Рэдактар *Лізавета Таран*
Мастак *Стася Сакалоўская*
Вёрстка *Валерыя Шкляр*
Карэктар *Лізавета Таран*

Падпісана да друку 02.12.2016. Фармат 84×108/32.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 5,88. Ул.-выд. арк. 4,02.
Наклад 500 асоб. Замова 2628.

Прыватнае выдавецкае ўнітарнае
прадпрыемства «Галіяфы».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных
выданняў № 1/48 ад 03.10.2013.
Пр. Партызанскі, 77А, 220107, Мінск.
E-mail: vish@bk.ru
www.halijafy.by

ТДА «НоваПрынт».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных
выданняў № 2/54 ад 25.02.2014.
Вул. Геалагічная, 59, корп. 4, каб. 10, 220138, Мінск.



ISBN 978-985-7140-29-9

9 789857 140299

ВЫДАВЕЦТВА
ГАЛІЯФЫ

Уладзімір Несцяровіч

# Эпоха русалкі